Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

*УДК 39:2–264 (=161.3)*

# Міфалогія беларусаў: уяўленні пра сусвет

В. С. НОВАК

У артыкуле на багатым аўтэнтычным матэрыяле асэнсоўваюцца міфалагічныя ўяўленні беларусаў, звязаныя з зоркамі, стыхіямі свету, засцярогамі ад маланкі і навальніцы, і дэманструецца паэтычнасць міфалагічнага светапогляду беларускага народа.
**Ключавыя словы:** традыцыя, міфалагічныя ўяўленні, мясцовая спецыфіка, сімволіка, зоркі, вада, агонь, зямля

On the basis of rich authentic material the article interprets the Belarusians' mythological concepts associated with the stars, the elements of nature, and the protection from lightning and thunderstorm. The poetic mythological world outlook of the Belarusian people is shown in the article.
**Keywords:** tradition, mythological concepts, local specificity, symbols, stars, water, fire, earth.

Глыбокае асэнсаванне асноў духоўнай культуры славян немагчыма без вывучэння фактычнага матэрыялу міфалагічных аповедаў, якія, як сведчаць палявыя экспедыцыйныя даследаванні, адрозніваюцца багаццем мясцовых асаблівасцей, паэтычнасцю ўспрымання з'яў навакольнага свету. Прадстаўлены ніжэй сінхронны зрэз сучаснай міфалагічнай традыцыі беларусаў, звязанай з сусветам, – яскравае пацвярджэнне ўстойлівага характару бытавання рэгіянальна-лакальных міфалагічных уяўленняў пра зоркі і стыхіі свету.

Зоркі, паводле міфалагічных уяўленняў жыхароў Гомельшчыны, "падобныя на рассыпанае зерне або на мноства жукоў-светлякоў, што ўзняліся высока-высока" (запісана ў г. Гомель ад Медзінай Тамары Фёдараўны, 1941 г. н.). Асэнсаванне зорак як душ памерлых людзей – надзвычай устойлівая традыцыя міфалагічнай свядомасці беларусаў. У шматлікіх міфалагічных аповедах гаворыцца аб тым, што зоркі – гэта своеасаблівыя "знакі чалавека на зямлі"( запісана ў г. Гомель ад Шкурко Адама Ігнатавіча, 1928 г. н.). "Менавіта гэтае атаясамленне зорак і душ ляжыць у падваліне ўяўленняў пра сувязь зорак і лёсаў людзей, заснаваных на іх гаданнях і прадказаннях" [1, с. 195]. Паводле народных уяўленняў, "неба цвёрдае, а да яго прылеплены звёзды. Звёзды на небе – то душы людзей" (запісана ў в. Саўгасная Буда-Кашалёўскага раёна ад Габрусевай Кацярыны Лагвенаўны, 1932 г. н.). Зыходзячы са сведчанняў Евы Васільеўны Пясоцкай, 1937 г. н., жыхаркі в. Вулька-2 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці, зоркі – гэта не столькі "людзі, што родзіліса", колькі гэта "вочкі Бога, які глядзіць за намі, а як хто саграшыў, то зорачка падае". "Божымі свечачкамі" называюць зоркі жыхары в. Сякерычы Петрыкаўскага раёна: "Зоркі – гэта божыя свечачкі. Гавораць, як Бог сатварыў Адама, так і першая зорка паявілася. Зорка – гэта жызнь чалавека" (запісана ад Кісель Ніны Адамаўны, 1932 г. н.). Такое ж паэтычнае асэнсаванне атрымалі зоркі ў міфалагічнай традыцыі в. Лядцы Гомельскага раёна: "Зоркі – гэта домікі ангелаў. І калі ўвечары свецяць тыя звёздачкі, то кажуць, што гэта ангелы адкрылі свае акошачкі" (запісана ад Кашлаковай Матроны Зосімаўны, 1927 г. н.).

З'яўленне зоркі на небе звязвалі з нараджэннем дзіцяці, а згасанне – са смерцю чалавека: "Калі загаралася зорка на небе, то казалі, што нарадзілася дзіця, а калі патухала – што паміраe чалавек" (запісана ў в. Мікітаўка Брагінскага раёна ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г. н.). Зыходзячы з народных вераванняў, калі "коціцца зорачка, то гэта нехрышчонае дзіця, якому Бог нідзе не дае месца на тым свеце. Калі бачыш такую зорку, трэба перахрысціцца і сказаць: "Ідзі ў рай, каб Бог яго прыняў да сябе" (запісана ў в. Мікітаўка Брагінскага раёна ад Данчанка Васіліны Ціханаўны, 1944 г. н.). Жыхары в. Сінічына Буда-Кашалёўскага раёна перакананы, што колькасць людзей на зямлі вымяраецца колькасцю зорак: "Колькі зорак на небе, столькі людзей на зямлі" (запісана ад Раманоўскай Лідзіі Іванаўны, 1933 г. н.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

З хуткасцю падзення зоркі звязвалі час смерці чалавека: "Падае зорка, значыць, памёр чалавек. Падае хутка – чалавек памёр быстра, не мучаўся на зямлі" (запісана ў в. Юшкі Калінкавіцкага раёна ад Рагальскай Марыі Міхайлаўны, 1930 г. н.). Па мігценні зорак вызначалі, якім быў чалавек пры жыцці, як сябе паводзіў у розных сітуацыях і ў адносінах з іншымі людзьмі: "Калі чалавек многа грашыць, то яго зорка чуць блісціць, а калі мала, то яна свеціць ясна-ясна" (запісана ў в. Перасвятое Рэчыцкага раёна ад Грабок Анастасіі Паўлаўны, 1936 г. н.). Па яркасці мігцення зорак меркавалі аб працягласці жыцця чалавека: "Чыя зорка большая, ярчэйшая, значыцца, той болей і пражыве" (запісана ў в. Асінаўка Светлагорскага раёна ад Рудніцкай Наталлі Сяргееўны, 1931 г. н.). З чым звязана забарона "паказваць пальцам на зоркі", невядома: "На зоркі не можна паказваць пальцам, а еслі паказал, то яго трэба ўкусіць тры разы" (запісана ў в. Вулька-2 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Якубовіч Аляксандры Іванаўны, 1936 г. н.).

На пытанне, як узніклі зоркі, жыхары г. Бабруйск Магілёўскай вобласці адказалі, што іх стварыў Бог (запісана ад Маскалёвай Людмілы Мікалаеўны, 1939 г. н.), а ў жыхароў в. Балотня Рагачоўскага раёна склалася меркаванне, што "зоркі на небе – гэта Бог агні зажог" (запісана ад Бужан Марыі Аляксандраўны, 1938 г. н.). Па ступені яркасці зоркі вызначалі якасці характару чалавека: "Калі зорка падала, але гарэла ярка, то чалавек быў чысты, добры, а калі гарэла цьмяна, то ён шмат грашыў" (запісана ў г. Гомель ад Драбышэўскай Надзеі Іванаўны, 1928 г. н.).

Шматлікія міфалагічныя ўяўленні звязаны з засцярогай ад маланкі і навальніцы. Паводле народных вераванняў, "маланка з громам – гэта калі Ілля-прарок па небу катаецца, кола грукоча, дык гром грыміць. Маланка – гэта ён злуецца" (запісана ў в. Краснаўка Светлагорскага раёна ад Паўлаўцовай Людмілы Уладзіміраўны, 1950 г. н.).

Варта падкрэсліць, што ў кожнай мясцовасці можна сустрэць па-мясцоваму адметныя праявы гэтых народных вераванняў, у якіх арганічна пяднаны як язычніцкія, так і хрысціянскія элементы. Што датычыць апошніх, то найбольш папулярным сродкам у народзе з'яўлялася запальванне свечкі на Крашчэнне і прагаворванне адпаведнай малітвы: "Каб засцерагчыся ад маланкі, трэба запаліць свечку ад Крашчэння і памаліцца Богу" (запісана ў г. Васілевічы Рэчыцкага раёна ад Сохар Алены Марцінаўны, 1944 г. н.). Каб маланка не спаліла хату, як пацвердзілі жыхары в. Сінск Лоеўскага раёна, трэба было "асвяціць у цэркві свечкі і запаліць іх у навальніцу" (запісана ад Прымак Фёклы Кузьмінічны, 1916 г .н.). Здаўна ў народзе лічылі, што калі будзеш працаваць на Ілью (2 жніўня), то можа здарыцца бяда: "Каб чалавека не ўбіла маланкай, на Іллю (2 аўгуста) не трэба працаваць, бо ліха будзе" (запісана ў в. Краснаўка Светлагорскага раёна ад Паўлаўцовай Людмілы Уладзіміраўны, 1950 г. н.). Устойлівым з'яўляецца меркаванне аб тым, што чалавеку пры жыцці грашыць нельга, інакш Бог можа раззлавацца і наслаць гром і маланку: "Бог зліўся, калі людзі многа грашылі" (запісана ў в. Асінаўка Светлагорскага раёна ад Цвірчанка Надзеі Станіславаўны, 1929 г. н.); "Гром злуецца на людзей, каб яны пакаяліся і болей не грашылі" (запісана ў в. Скепня Жлобінскага раёна ад Мельнікавай Алены Рыгораўны, 1923 г. н.).

У некаторых мясцовасцях Гомельшчыны з мэтай засцярогі ад маланкі выконвалі звычай абходу хаты з іконай "Неапалімая купіна". У в. Уборак Лоеўскага раёна верылі, што "ў час маланкі нужна аббегці вакол хаты з этай іконай" (запісана ад Бярнацкай Валянціны Мікалаеўны, 1953 г.н.). Да ліку прасцейшых спосабаў засцярогі ад маланкі ў в. Івольск Буда-Кашалёўскага раёна адносяцца закрыванне юшкі ў печцы і забарона сядзець каля акна: "Каб засцярэгчыся ад грому і маланкі, трэба было закрыць юшку ў пячы і адкрыць шторы. Ля вакна нельга было сядзець"(запісана ад Малчанавай Ніны Сцяпанаўны, 1941 г.н.). Зыходзячы з народных вераванняў жыхароў в. Гарывада Рэчыцкага раёна, каб пазбегнуць боязі маланкі, прадугледжаны такія магічныя дзеянні, як асвячэнне галінкі вярбы на Вербніцу і яе спальванне: "У царкоўны празнік "Вербнае" трэба пасвяціць вярбу і паставіць гэтую вярбу на вакно ў вуглік у кожнай комнаце. А яшчэ, як бачыш, што надвігаецца навальніца, адкрый комін у печы ці грубе, запалі гэтую святую вярбу трошкі, каб душок толькі з яе прайшоў, і закрый комін, і тады не страшна ніякая маланка" (запісана ад Грабцэвіч Раісы Ульянаўны, 1937 г. н.).

Міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з агнём, таксама маюць багатую мясцовую спецыфіку. Сакральны характар прыроды агню раскрываецца ў аповедах, звязаных з яго паходжан-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нем. Устойлівым з'яўляецца меркаванне аб тым, што святы агонь той, які атрыманы ў выніку трэння аднаго кавалка дрэва аб другі. У народнай свядомасці існуе некалькі версій з'яўлення агню, паводле адной з якіх менавіта Бог паслаў на зямлю агонь: "Агонь Бог даў людзям, калі яны скіталіся. Калі ён выгнаў першага чалавека з раю, то чалавек пачаў дрыжаць ад холаду. І тады чалавек па загаду Бога ўзяў два кускі дрэва і стаў іх церці. І так дабыў агонь" (запісана ў в. Скепня Жлобінскага раёна ад Мельнікавай Алены Рыгораўны, 1923 г. н.). "Па адной з версій, агонь упершыню трапіў на зямлю разам з Перуном. Бог паслаў яго на зямлю, каб пакараць чорта, які спакусіў першых людзей свету – Адама і Еву. Чорт схаваўся за ясенем, а Бог перуном запаліў яго. З таго часу людзі пачалі разводзіць агонь і карыстацца ім" [1, с. 17]. Амбівалентны характар народных уяўленняў, звязаных з агнём, пацвярджаецца канкрэтнымі аповедамі. Паводле сведчанняў Анастасіі Паўлаўны Грабок, 1936 г. н., з в. Перасвятое Рэчыцкага раёна, "агонь чалавека сагравае. Пішчу на ём можна варыць. А можа і спаліць, пажар нарабіць". З засцерагальнай сімволікай агню звязаны дзеянні з ім у Чысты чацвер: "Святы агонь прыносяць з цэрквы ў хату ў Чысты чацвер пасля малебні. Данесці неабходна запаленым ад цэрквы. Дома неабходна, не паліўшы свет, над дзвярыма зрабіць свечкай тры красты, якія ахоўваюць цэлы год ад небяспекі" (запісана ў г. Васілевічы Рэчыцкага раёна ад Сохар Алены Марцінаўны, 1944 г. н.). Агонь як адна з касмічных стыхій свету супрацьстаіць вадзе. "У многіх міфалогіях, у тым ліку і ў беларускай, вада звязваецца з пачаткам стварэння Сусвету, дзе яна сімвалізуе Хаос" [1, с. 57].

Паводле мясцовых народных уяўленняў, "вада – гэта малодшая сястра зямлі, агонь – гэта іхні брат" (запісана ў в. Залессе Чачэрскага раёна ад Карпенкінай Ганны Якаўлеўны, 1941 г. н.). "Сімволіка вады звязана, з аднаго боку, з яе прыроднымі ўласцівасцямі – свежасцю, празрыстасцю, са здольнасцю ачышчаць, з хуткім рухам, з другога боку, з міфалагічнымі ўяўленнямі аб вадзе як аб "чужой" і небяспечнай прасторы. Падобная дваістая ацэнка вады як аздараўляючай і адначасова смертаноснай стыхіі праявілася ў казачных матывах жывой і мёртвай вады" [2, с. 388].

У народных вераваннях адрозніваюць жывую і мёртвую ваду, пры гэтым жывой вадой называць "тую ваду, якая цячэ з крыніц. Людзі памыюцца ёй і здаравейшыя стануць. Яна ісцэляюшчая" (запісана ў в. Перасвятое Рэчыцкага раёна ад Грабок Анастасіі Паўлаўны, 1936 г. н.). Зыходзячы з народных вераванняў, мёртвай з'яўляецца тая вада, якой звычайна "мылі пакойніка, яна мёртвая. Таму што ў ёй засталося тое зло ад гэтага чалавека. Яе нада была выліваць вельмі далёка ад хаты" (запісана ў в. Залессе Чачэрскага рёна ад Карпенкінай Ганны Якаўлеўны, 1941 г. н.). Жыхары в. Калініна Буда-Кашалёўскага раёна верылі, што жывой вадой як святой карысталіся пры вылячэнні цяжкіх хвароб: "Все цяжолыя балезні лечацца святой вадой. Эту ваду бралі з трох цэркваў. Так гаварылі старыя людзі. Ваду набіралі моўчкі" (запісана ад Паплаўнай Лідзіі Мікалаеўны, 1951 г. н.). Мёртвай у народзе лічылі "стаячую ваду".

Вадой як ачышчальным сродкам карысталіся ў знахарскай практыцы: "Каб зняць порчу, знахаркі загаворвалі ваду і давалі піць, а то і вылівалі пад асіну ці бярозу" (запісана ў г. Гомель ад Караленка Вольгі Фёдараўны, 1933 г. н.). Асаблівае магічнае значэнне набывала вада, якую асвячалі на свята Вадохрышча: "Такую ваду давалі піць хвораму і паміраючаму, ёй апрыскваюць новую хату (вуглы асабліва). Святой вадой асвячалі труну, перш чым пакласці нябожчыка. Трэба ў гэтае свята з самай раніцы памыцца, каб увесь год быць здаровым" (запісана ў в. Бальшавік Гомельскага раёна ад Логвінавай Марыі Мікалаеўны, 1924 г. н.). Пасвечанай вадой прынята было апырскваць кожны куток у хаце, каб "не было якіх-небудзь нячысцікаў" (запісана ў в. Вішнёўка Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці ад Нарвілась Наталлі Уладзіміраўны, 1940 г. н.). Сярод устойлівых народных вераванняў, звязаных з вадой, вылучаецца, напрыклад, вера ў цудадзейную сілу пасвечанай вады, якая "можа стаяць шмат часу і не сапсавацца" (запісана ў в. Кісцяні Рагачоўскага раёна ад Касцючэнка Т.Н., 1970 г. н.).

Забароны пляваць і кідаць у ваду нечыстоты абумоўлены сакральнасцю яе прыроды, а таксама тым, што "вада – мяжа паміж "гэтым" і "тым" светам, шлях у іншасвет, месцазнаходжанне душ памерлых і нячыстай сілы, што тлумачыцца сувяззю вады з пачатковым першабытным хаосам" [1, с. 58]. "Вада – у народных уяўленнях адна з першых стыхій сусвету,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

крыніца жыцця, сродак магічнага ачышчэння. Разам з тым водная прастора асэнсоўвалася як мяжа паміж тым і гэтым светам, шлях у іншасвет, месца знаходжання нячыстай сілы і душ памерлых” [2, с. 386].

У народных вераваннях беларусаў зямля асэнсоўваецца як адзін з элементаў, які мае дачыненне да стварэння свету. “У касмаганічных паданнях падкрэсліваецца, што першай Бог стварыў менавіта зямлю” [1, с. 200]. Жыхары в. Юшкі Калінкавіцкага р-на перакананы, што зямлю стварыў Бог, аднак “нячыстая сіла ie i на зямлі, і на небі” (запісана ад Бандарэнка Лізаветы Яўменаўны, 1932 г. н.). У шматлікіх міфалагічных аповедах сцвярджаецца, што зямля мае круглую форму, а паняцце “край свету” выступае ў кантэкстах рознай семантычнай скіраванасці: “Ідуць на край свету, каб ніхто не найшоў, каб уцекці ад непрыятнасцей” (запісана ў в. Шырокае Буда-Кашалёўскага р-на ад Цітовай Надзеі Васільеўны, 1939 г. н.); “Край свету ўсюды, а ідуць на край свету з гора” (запісана ў в. Пучын Брагінскага р-на ад Балобан Евы Рыгораўны, 1929 г. н.).

Паводле міфалагічных уяўленняў беларусаў і іншых народаў, зямля мела яскрава выражаны жаночы пачатак, што пацвярджаецца сведчаннямі саміх жыхароў: “Усе ўяўлялі зямлю ў вобразе прыгожай жанчыны, якая была вельмі мудрая” (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Карпенкінай Ганны Якаўлеўны, 1941 г. н.).

Асэнсаванне зямлі як маці, “карміцелькі”, абумовіла сакральнасць яе прыроды. “Аб гэтым сведчаць шматлікія забароны і рэгламентацыі паводзінаў людзей у дачыненні да зямлі: яе нельга біць калом, розгай, бізуном, калупаць нагой” [1, с. 201].

Устойлівай з’яўляецца забарона кідаць на зямлю якія-небудзь нечыстоты, пляваць: “Таксама на зямлю нельга пляваць – у гэтага чалавека магла ўзнікнуць якая-небудзь цяжкая хвароба” (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Карпенкінай Ганны Якаўлеўны, 1941 г. н.).

Асэнсаванне фалькорных матэрыялаў, звязаных з міфалагічнымі ўяўленнямі беларусаў пра сусвет, пераконваюць, наколькі багатымі і шматстайнымі з’яўляюцца лакальна-рэгіянальныя праявы агульнаэтнічнай міфалагічнай традыцыі.

**Літаратура**

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.

2. Славянские древности. Этнолингвистич. словарь: в 5 т. Т. 1 : А-Г-М / под общ. ред. Н.И. Толстого. – М.: Международные отношения, 1995. – 584 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 21.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ